# Алег Трусаў:

## *Беларуская мова - зброя ў супрацьстаянні Расейскай імперыі*



Алег Трусаў і Алена Анісім сустрэліся ў Глыбокім з мясцовымі актывістамі. Яны адзначылі выдатную працу суполкі ТБМ у мястэчку Падсвілле на Глыбоччыне і падзякавалі прысутным за ўдзел у Кангрэсе за незалежнасць і падпісанне Маніфесту ў абарону незалежнасці Беларусі. Як зазначыў старшыня грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алег Трусаў, калі беларусы захаваюць мову - яны ніколі не страцяць незалежнасць. Таму трэба прынцыпова размаўляць пабеларуску - гэта самая моцная зброя ў супрацьстаянні Расейскай імперыі.

- Страцім мову - аўтаматычна станем аселіцай Расейскай імперыі. І таму Расея робіць усё магчымае, каб мы гэтую мову страцілі. Пачынаючы з раздзелу Рэчы Паспалітай, Расея траціць шаленыя грошы, каб тут запанаваў "русский мир": і казакі ў нас з'яўляюцца, і папоў праваслаўных прысылаюць, чаго толькі не робяць. Таму што без Украіны і без Беларусі Расейская імперыя не існуе.



Падчас сустрэчы прысутныя абмяняліся падарункамі. Прадстаўнікі галоўнага офісу ТБМ падаравалі глыбачанам беларускамоўныя кнігі, календары і газеты, а глыбачане - магніты з выявамі горада і кнігі мясцовых краязнаўцаў. Адбылася і прэзентацыя першай кнігі "Кароткая гісторыя Міёр" краязнаўца з Мёраў Сяргея Васільева.

***Таццяна Смоткіна**,*

*Беларускае Радыё Рацыя.*

*Фота аўтара.*